ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ... АЛЕ ПА ПРАВІЛАХ

Беларусь — за чысціню і празрыстасць у спорце

Такую пазіцыю агучыў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з генеральным сакратаром Міжнароднай федэрацыі баскетбола (ФІБА) Патрыкам Баўманам.

У пачатку сустрэчы Прэзідэнт павітаў госця ў Беларусі, а таксама падзякаваў яму за тое, што нашай краіне даручылі правесці сусветнае першынство. «Пакуль — сярод моладзі. Я думаю, мы сябе добра зарэкамендуем у арганізацыі гэтага чэмпіянату, і вы нам даверыце больш складанае мерапрыемства», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар са свайго боку гарантаваў поўную цікавасць гледачоў да любога мерапрыемства, што праводзіцца пад эгідай Міжнароднай федэрацыі баскетбола, а таксама ўсё неабходнае для правядзення спаборніцтваў высокага ўзроўню.

«Я думаю, кіраўнік нашай федэрацыі (баскетбола. — **«Зв.»**) вам расказаў пра нашы магчымасці, пра лагістыку, якую мы маем, — адзначыў Прэзідэнт. — І вы будзьце ўпэўненыя: калі мы за нешта возьмемся, то зробім на самым высокім узроўні, бо да гэтага заўсёды далучаюцца дзяржаўныя органы, структуры, і любое мерапрыемства ў нас па любым відзе спорту — гэта падзея дзяржаўнага маштабу».

Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз падкрэсліў: у Міжнароднай федэрацыі баскетбола могуць быць спакойныя за арганізацыю любога мерапрыемства, якое будзе даручана беларускаму боку.

Таксама Аляксандр Лукашэнка выказаў уласную пазіцыю як кіраўніка Нацыянальнага алімпійскага камітэта па важных, надзённых пытаннях развіцця сусветнага спорту ў цэлым.

«Мы — за чысты спорт, мы — за поўную празрыстасць і чысціню дзейнасці міжнародных арганізацый, у тым ліку і Міжнароднага алімпійскага камітэта, — падкрэсліў беларускі лідар. — Мы — прыхільнікі абароны спартсменаў, каб яны не пакутавалі, асабліва чыстыя спартсмены. Нельга вінаваціць у цэлым каманду, мы лічым, што кожны спартсмен павінен несці персанальную адказнасць за допінг і іншыя неспартыўныя паводзіны. Словам, мы за празрыстасць Сусветнага антыдопінгавага агенцтва і іншых міжнародных спартыўных камітэтаў, і перш за ўсё — МАК».

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў Беларусі вельмі шмат прэтэнзій да Міжнароднага алімпійскага камітэта. На яго думку, гэтая арганізацыя не проста бюракратычная, а часам і безадказная.

Як кіраўнік НАК Аляксандр Лукашэнка плануе на чарговым мерапрыемстве давесці гэта да ведама міжнароднай спартыўнай грамадскасці. «Нельга цалкам ператвараць спорт у частку бруднай палітыкі. Мы катэгарычна супраць гэтага. Спорт павінен быць чысты, падыход да ўсіх павінен быць аднолькавы», — зноў падкрэсліў Прэзідэнт.

Патрык Баўман адзначыў, што для яго гэтая сустрэча — падвойны гонар, паколькі ён сустракаецца не толькі з Прэзідэнтам краіны, але і з кіраўніком Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Ён падзякаваў Беларусі і асабіста Аляксандру Лукашэнку за тую падтрымку, якая аказваецца пры правядзенні чэмпіянату свету па баскетболе сярод дзяўчат да 17 гадоў.

«Мы адзначаем той прагрэс, якога ўжо дасягнула жаночая зборная Беларусі па баскетболе», — сказаў Патрык Баўман. Ён падкрэсліў: зыходзячы з таго, што ён убачыў, усе працуюць выключна добра, а чэмпіянат ужо можна назваць паспяховым.

«Калі мы пяройдзем да тэмы Сусветнага антыдопінгавага агенцтва, то я абсалютна падзяляю ваш пункт гледжання аб тым, што мы павінны абараняць чысты спорт і чыстых спартсменаў», — дадаў генеральны сакратар.

Пазней у размове з журналістамі Патрык Баўман адзначыў, што ён сапраўды ўражаны арганізацыяй турніру. Паводле яго слоў, узровень мерапрыемства прыемна здзівіў і каманды. «Апошні раз я быў у Мінску 20 гадоў таму, і мне вельмі радасна бачыць, як змяніўся горад, як тут добра», — адзначыў генеральны сакратар.

У Беларусі ёсць усе шанцы для правядзення маштабных мерапрыемстваў у гэтым відзе спорту, дадаў Патрык Баўман. Для гэтага створана цудоўная інфраструктура, ёсць федэрацыя, у якой працуюць прафесіяналы. «Мы будзем толькі рады, калі Беларусь будзе падаваць заяўкі на правядзенне больш буйных турніраў», — дадаў ён.

Нагадаем, з 21 да 29 ліпеня ў беларускай сталіцы праходзіць чэмпіянат свету па баскетболе сярод дзяўчат да 17 гадоў. Спаборніцтвы сусветнага ўзроўню ў гэтым відзе спорту Беларусь прымае ўпершыню ў сваёй гісторыі.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

БЕЗ БАЛАСТУ

З 1 верасня ў Акадэміі кіравання непатрэбных у кіраванні людзей вучыцца не павінна

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка перад тым, як заслухаць даклад аб выкананні даручэнняў па ўдасканаленні дзейнасці гэтай ВНУ.

«Прызначаючы новага рэктара, мы дамаўляліся пра тое, што істотна адновім работу Акадэміі кіравання па ўсіх кірунках, — нагадаў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба зрабіць так, каб кожны чалавек, які пройдзе падрыхтоўку, перападрыхтоўку, атрымае адукацыю, павысіць кваліфікацыю ў Акадэміі кіравання, быў запатрабаваны».

Беларускі лідар падкрэсліў: не патрэбны людзі, якія проста пройдуць па Акадэміі, атрымаюць дыплом і не будуць запатрабаваны ў органах кіравання. «Вы самі разумееце, што гэта адзіная навучальная ўстанова пры Прэзідэнце. Там павінны быць падрыхтаваны кваліфікаваныя, разумныя, выхаваныя людзі, адданыя нашай дзяржаве і народу. Няхай тое нават гучна прагучыць, але гэта так», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

На нарадзе прысутнічалі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава, міністр адукацыі Ігар Карпенка і рэктар Акадэміі кіравання Генадзь Пальчык. Прэзідэнт нагадаў ім, што да верасня яму павінны ўнесці прапановы па ўдасканаленні навучальнага працэсу. «Па асобах, якіх мы будзем туды запрашаць для навучання па ўсіх кірунках. Па выкладчыках: якія крытэрыі і патрабаванні, унесці прапановы па выкладчыцкім складзе — калі ўжо прапрацавана, спешкі тут быць не павінна, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Па методыцы выкладання, па рознага роду метадычных матэрыялах. Цэлы комплекс адукацыйны — і па ім павінны быць прапановы».

Беларускі лідар звярнуўся да прысутных з наступнымі пытаннямі: што зроблена на сённяшні дзень і што неабходна яшчэ зрабіць, якія патрэбны дапамога і падтрымка? «Часу для разварушвання няма. З 1 верасня ў Акадэміі кіравання непатрэбных у кіраванні людзей быць не павінна», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Як расказаў Генадзь Пальчык, кіраўніцтвам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь была праведзена наступная работа. Па-першае, быў дапрацаваны дзяржаўны заказ на падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі кіруючых кадраў, а таксама асоб, уключаных у рэзервы кіруючых кадраў, на новы навучальны год.

У Акадэміі вывучылі патрэбу дзяржаўных органаў і арганізацый у адпаведных спецыялістах. Аб'ёмы падрыхтоўкі неабходных прафесіяналаў былі скарэктаваны на падставе маркетынгавых даследаванняў. Быў спынены набор на перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, па дзяржаўным заказе па дзесяці спецыяльнасцях.

Пазаўчора ў лік студэнтаў залічана 100 чалавек. Прахадны бал на дзённую форму навучання за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту на спецыяльнасць «дзяржаўнае кіраванне і права» склаў 343 балы (у 2017 годзе — 338), «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка» — 336 балаў (291 — у папярэднім годзе), «кіраванне інфармацыйнымі рэсурсамі» — 341 (310 — у 2017-м). Плануецца, што ў будучым годзе абітурыентам акрамя цэнтралізаванага тэсціравання неабходна будзе праходзіць і гутарку, што падтрымаў і Прэзідэнт, — пры ўмове, што праходзіць яна будзе празрыста.

Важна, што сярод першакурснікаў 84 % — іншагароднія. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на гэты аспект, паколькі такія студэнты ведаюць жыццё не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах і малых населеных пунктах. Абмяркоўвалі і матэрыяльна-тэхнічную базу — не толькі Акадэміі кіравання, але і ўсіх ВНУ. Беларускі лідар запатрабаваў прывесці ў парадак інтэрнаты і сталовыя.

Дарэчы, асабліва кіраўнік дзяржавы адзначыў, што выпускнікі Акадэміі кіравання павінны быць выключнымі, бо ў будучыні яны сфарміруюць кіраўнічы склад краіны. І яшчэ адно патрабаванне Прэзідэнта: навучальныя працэсы ў кожнай ВНУ трэба аптымізаваць на прыкладзе Акадэміі, нідзе не павінна быць нічога лішняга, пры гэтым да падрыхтоўкі кадраў трэба падыходзіць без фармалізму.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

Домрачава стала першым зорным паслом

Фонд «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» абвясціў аб запуску інфармацыйнага праекта «Зорныя паслы II Еўрапейскіх гульняў»

Першым уладальнікам гэтага тытула стала чатырохразовая алімпійская чэмпіёнка Дар'я Домрачава. Сертыфікат аб прысваенні звання зорнага пасла вядомай спартсменцы ў зале Алімпійскай славы Нацыянальнага алімпійскага камітэта ўручыў дырэктар фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Георгій Катулін.

Домрачава адзначыла, што для яе вельмі ганарова стаць першым зорным паслом буйнога турніру. Дар'я не сумняваецца, што на II Еўрапейскіх гульнях павінны заззяць новыя зоркі спорту, якія пасля будуць успамінаць беларускую сталіцу як горад, у якім яны дамагліся сваіх першых вялікіх поспехаў.

Георгій Катулін падкрэсліў, што прыярытэтнымі задачамі праекта з'яўляюцца прасоўванне і фарміраванне станоўчага іміджу II Еўрапейскіх гульняў у Беларусі і за яе межамі, прыцягненне да іх грамадскай увагі, стымуляванне цікавасці жыхароў Беларусі і сусветнай грамадскасці да мультыспартыўнай падзеі, папулярызацыя відаў спорту, уключаных у праграму Еўрапейскіх гульняў.

У лік зорных паслоў увойдуць выдатныя асобы са свету спорту, мастацтва і культуры не толькі Беларусі, але і замежных краін. Услед за Дар'яй Домрачавай сертыфікаты зорных паслоў II Еўрапейскіх гульняў атрымаюць вядомыя цыркавыя артысты браты Запашныя.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

З-за лясных пажараў пад Афінамі загінулі дзясяткі чалавек

Лясныя пажары ў прыгарадзе Афін за суткі забралі жыцці па меншай меры 50 чалавек (сярод іх шмат маленькіх дзяцей), больш за 170 атрымалі сур'ёзныя траўмы, паведамляюць Ekathimerini.com і Amna News. Пацярпелі як мясцовыя жыхары, так і турысты ў курортных пасёлках Маці, Рафіны, Неас Вутсас і Пентэлі. Мясцовыя СМІ паведамляюць, што людзі апынуліся заблакаваныя агнём у дамах і аўтамабілях або спрабавалі выратавацца ў моры, але патанулі. Пры гэтым улады не выключаюць, што нейкія пажары ўзніклі з-за падпалаў, што неаднойчы здаралася ў папярэднія гады. У панядзелак таксама падняўся моцны вецер, які паспрыяў распаўсюджванню агню. Дапамогу сваіх ратавальнікаў Грэцыі прапанавалі Кіпр, Ізраіль, Іспанія, Балгарыя, Італія, Германія, Францыя. Агенцтва Reuters адзначае, што гэта самы магутны пажар у краіне з 2007 года, калі выгарэў паўднёвы Пелапанэс.

У Сеуле прапанавалі сёлета афіцыйна завяршыць Карэйскую вайну

Кіраўнік паўднёвакарэйскага міністэрства па справах аб'яднання Чо Мён Гюн заявіў, што, на яго думку, да канца 2018 года магчыма выканаць усе фармальнасці, якія б дазволілі афіцыйна завяршыць Карэйскую вайну. «Ідуць кансультацыі паміж Паўднёвай, Паўночнай Карэяй і ЗША», — адзначыў міністр, словы якога прыводзіць тэлеканал YTN. У той жа час, кажучы аб больш павольным, чым чакалася, прагрэсе ў справе дэнуклеарызацыі Карэйскага паўвострава, Чо Мён Гюн заявіў, што ЗША і КНДР, відаць, патрабуецца больш часу для пераадолення варожасці. Як вядома, актыўныя ваенныя дзеянні на Карэйскім паўвостраве доўжыліся з 1950 да 1953 года, аднак дагавор аб спыненні вайны дагэтуль не падпісаны.

Улады Харватыі спісалі даўгі грамадзян на 178 мільёнаў еўра

Урад Харватыі спісаў даўгі 150 тысяч грамадзян перад падатковымі і іншымі дзяржорганамі на суму 1,3 мільярда кун (каля 178 мільёнаў еўра), заявіў прэм'ер-міністр Андрэй Пленкавіч. Дапамога дзяржавы даўжнікам — фізічным асобам стала магчымая пасля ўступлення ў сілу 21 ліпеня пакета законаў аб фінансавай падтрымцы грамадзян. Гаворка ідзе пра запазычанасць 326,3 тысячы чалавек на агульную суму ў 43,6 мільярда кун (каля 581 мільёна еўра), не лічачы пеняў і працэнтаў. Першымі спісалі даўгі памерам да 10 тысяч кун (каля 1,3 тысячы еўра), з-за якіх раней былі блакаваныя асабістыя рахункі грамадзян.

Утерянные представительством Белгосстраха по Пуховичскому району квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1 СУ серия СВ №№ 2537615–2537620 в количестве 6 шт. **считать недействительными.**

УНП 100122726

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению филиала «Автобусный парк № 2» ОАО «Миноблавтотранс» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже **здания склада инв. № 645/С-6624 общей площадью 520,6 кв. м, расположенного на земельном участке площадью 0,3144 га с кадастровым номером 625250100030000035** (право постоянного пользования) **по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Колхозная, 33.**

Начальная цена с НДС (20 %) – 25 920,00 бел. руб. Стоимость снижена на 80 %. Задаток 10 % от начальной цены (2 592,00 бел. руб.).

Задаток перечисляется на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона в течение 10 (десять) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Белорусская Нива» («Сельская газета») от 23.09.2017 и газете «Звязда» от 11.01.2018, 26.04.2018. Аукцион состоится **07.08.2018** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.08.2018** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**